http://euraforum.info/

Мінск, 14 лістапада

# Еўрапейскі Саюз - наша будучыня!

# Беларускі Еўрапейскі Форум

Чытайце на стар.7

ПРАЎДА Мастоўская

Калі вы жадаеце атрымліваць у далейшым наша выданне, калі ласка, дашліце sms з паведамленнем адраса, на які павінна прыходзіць «Мастоўская праўда» на нумар : + 48 500 383480

№ 3-4 (74-75) ліпень – жнівень 2009 года



Пісьменнік Васіль Якавенка і грамадскія актывісты на магіле М. Явара

# Ушанавалі памяць паэта Міхася Явара

**26 ліпеня пісьменнікі Лявон Вашко, Васіль Якавенка, Юрась Гумянюк і актывісты руху «За свабоду» ўшанавалі памяць паэта Міхася Явара. Яны наведалі вёскі Лунна, Мінявічы і Падбараны.**

У Мінявічах 26 ліпеня 1903 года з'явіўся на свет будучы паэт. У вёсцы дагэтуль захавалася хата, дзе жыў Міхась Явар і недалёка ад якой ён скончыў жыццё самагубствам. Побач з вёскаю на беразе Нёмана ляжыць памятны камень прысвечаны паэту.

Каля яго актывісты зачыталі вершы паэта.

У населеным пункце Лунна грамадскія актывісты наведалі вуліцу, названую імем Міхася Явара і высаджаную ў яго гонар яварамі. На магіле паэта ў вёсцы Падбараны былі ўскладзены кветкі і запалены свечы.

«Ужо другі год мы ўшаноўваем памяць нашага славутага земляка, паэта Міхася Явара. Можна сказаць, што склалася пэўная традыцыя. Безумоўна, мы ганарымся і шануем тое, што на Мастоўшчыне нарадзіўся, жыў і працаваў паэт – патрыёт Міхась Явар,» — пракаментаваў "Мастоўскай Праўдзе" арганізатар мерапрыемства Алесь Зарэмбюк.

Наталля БАРЫСЮК



Алесь Зарэмбюк чытае вершы Міхася Явара ў вёсцы Мінявічы

## У Мастоўскім раёне 44 прапагандысцкія групы

У Мастоўскім раёне працуе 44 інфармацыйна-прапагандысцкія групы: 6 груп арганізавана пры райвыканкаме, 10 — пры сельсаветах, 27 - у працоўных калектывах, 1 група створана БРСМ.

Толькі сёлета прапагандысцкія групы 329 разоў сустракаліся з насельніцтвам. Галоўнай мэтай такіх сустрэчаў, па словах саміх жа прапагандыстаў, з'яўляецца данясенне «важнай грамадска-палітычнай інфармацыі».

## План па атводу ліўневых і грунтовых водаў будзе распрацаваны

Па пытанню падтаплення будоўляў і агародаў ліўневымі водамі, старшыня Мастоўскага райвыканкама Аляксей Шафарэвіч, паведаміў, што Мастоўскі райвыканкам распрацоўвае мерапрыемствы па атводу ліўневых і грыунтовых водаў з паніжаных тэрыторый горада. Арганізацыя неабходных работ па ўладкаванню дранажнай сістэмы плануецца ў 2009 — 2010 годзе.

## Мясцовая ўлада не хоча спрыяць Беларуска - еўрапейскаму форуму

Мастоўскія ўлады адмовілі ў памяшканні для правядзення сходу па вылучэнню дэлегатаў на Беларуска - еўрапейскі форум, які адбудзецца ў Мінску 14 лістапада.

Старшыня мастоўскага райвыканкама Аляксей Шафарэвіч патлумачыў адмову тым, што ў дзень сходу большасць прадпрыемстваў горада не будзе працаваць, а ў памяшканнях іншых ужо запланаваныя культурна-масавыя мерапрыемствы.

**АПЫТАННЕ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ САЙТА masty.belarda.org**

Як вы ацэньваеце працу мастоўскіх уладаў па пераадоленню эканамічнага крызісу?




4% Вельмі добра
3% Добра
8% Кепска
13% Вельмі кепска
72% Яны не працуюць, а толькі праядаюць дзяржаўныя грошы

Усяго прагаласавала: 104

## У Мастоўскім раёне людзі масава не плацяць за святло

За несваечасовую аплату святла ў Мастоўскім раёне сёлета адключылі ад электраэнергіі больш за 160 абанентаў. Паводле заканадаўства, адключэнне адбываецца ў выпадку калі спажывец не плаціць за электрычнасць 2 і болей месяцы.

## Кіраўнікі абавязаныя арганізаваць падпіску на кантраляваныя СМІ

У Мастах прайшла чарговая сесія Мастоўскага раённага Савета дэпутатаў. Па яе выніках была дадзена рэкамендацыя кіраўнікам прадпрыемстваў забяспечыць кантроль за падпіскай на «дзяржаўныя кантраляваныя выданні».

Паводле http://masty.belarda.org, http://belradio.fm

# Выратавальнікі з МНС наведалі лагеры адпачынку дзяцей

**Ужо стала традыцыяй, што мастоўскія выратавальнікі наведваюць хлопцаў і дзяўчынак у дзіцячых аздараўленчых лагерах «Нёман» і «Дашкаўцы». І гэты год не стаў выключэннем, хоць і прынёс некаторыя карэктывы. Так, у 2-ой змене лагера «Нёман» прайшло мерапрыемства «Бяспечнае лета».**

Дадзенае мерапрыемства было накіраванае на папярэджанне гібелі і траўматызму дзяцей на пажарах і ў іншых надзвычайных сітуацыях, а таксама фармаван-



не ў маладога пакалення тэарэтычных і практычных навыкаў асноў бяспечнай жыццядзейнасці. Дзеці актыўна прымалі ўдзел у віктарынах і конкурсах. Зараблялі балы, па выніках якіх былі вызначаныя пераможцы. Па-за агульным залікам праводзіўся конкурс насценгазет на тэму «Не гуляй з агнём», за які пераможцы атрымалі ў якасці прыза торт.

Невыказанае захапленне свяцілася ў вачах рабят, калі пачалася дэманстрацыя пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі. Тым больш што да ўзбраення можна было дакрануцца, гарнітуры і баявую вопратку прымерыць і нават «пастраляць» вадзянымі зарадамі. На працягу ўсяго дня ў лагеры «Нёман» гучалі музыка, апладысменты і дзіцячы смех, а ў атмасферы свята і весялосці кружылі аблокі паветрана-механічнай пены.

Мастоўскі МНС

# Вывучаць 12 урокаў Еўропы ў Мастах не будуць

**Аддзел адукацыі Мастоўскага райвыканкама не задаволіў прапанову члена Савета праваабаронча – асветніцкага грамадскага аб'яднання "Рух « За свабоду» Алеся Зарэмбюка, якая тычылася факультатыўнага курсу «Еўропа ў 12 уроках». Спадар Зарэмбюк прапанаваў для вывучэння ў мастоўскіх школах брашуру прафесара Парыжскага інстытута палітычных даследаванняў Паскаля Фантэйна, якая так і называецца «Еўропа ў 12 уроках». Факультатыўны курс, прапанаваны Зарэмбюком распавядае аб гісторыі і сучаснасці Еўрапейскага саюза.**

«Улічваючы імклівае развіццё стасункаў паміж аб'яднанай Еўропай і Рэспублікай Беларусь ,мне падаецца, што валоданне дадзеным курсам палегчыла б стасункі паміж жыхарамі Мастоўшчыны і нашымі суседзямі ЕС. Тым больш, што еўрапейцы нашы самыя блізкія суседзі, а наш горад пабрацім Астраленка, знаходзіцца на тэрыторыі Еўрапейскага Саюза. Упэўнены, што мастоўскім вучням старэйшых класаў гэты курс быў бы не толькі цікавым, але ж і даволі карысным у жыцці,» - паведаміў "Мастоўскай Праўдзе" Алесь Зарэмбюк.

Ігар АСКІРКА

# У Мастах зноў праводзяць масавую дактыласкапію

**У апошнія дні жніўня мужчынская частка насельніцтва Мастоў зноў пачала масава атрымоўваць позвы з патрабаваннем прыйсці ў Мастоўскі РАУС для праходжання дактыласкапіі.**

Позвы прыходзяць да мужчын, якія раней па нейкіх прычынах не прайшлі працэдуру.

Трэба адзначыць, што ў сакавіку гэтага года актывісты праваабаронча асветніцкага грамадскага аб'яднання "Рух «За Свабоду» атрымалі адказ на свой зварот у Мастоўскі РАУС, у якім яны патрабавалі патлумачыць прычыны масавага выкліку жыхароў нашага горада для зда-



чы дактыласкапіі. Тады ў адказе мастоўскія міліцыянеры прызналі, што працэдура носіць «неабавязковы характар» і ў выпадку адмовы грамадзянін не будзе паддзены прымусовай дактыласкапіі. Пасля гэтага позвы з прапановай прыйсці на дактыласкапію паўгода не прыходзілі да мастаўчан.

Даведка "Мастоўскай Праўды"

## Медаль за экспазіцыю марак прысвечаную Біблії

**Філатэліст з Лунна Лявон Карповіч атрымаў медаль і дыплом за сваю экспазіцыю марак пад назваю «Сьлядамі Біблії», якую ён прадставіў на Нацыянальнай філатэлістычнай выставе «Белфіла 2009».**

У экспазіцыі было выкарыстана каля 250 марак з розных краін свету і ўжыта 116 цытат з Біблії.

Узнагароды па выніках выставы, якая праходзіла ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, уручыла нашаму земляку намеснік Міністра сувязі і інфарматызацыі Ніна Гаўрылава.

## Рабочыя «Мастоўдрэва» дачакаліся выплаты запазычанасцяў

**Рабочыя дрэваперааапрацоўчага завода «Мастоўдрэў» у лістападзе-снежні 2008 года атрымалі толькі частку сваіх заробкаў. Чакаць астатнія грошы ім давялося амаль год.**

Гэта пры тым, што ў пачатку 2009-га года мастоўская пракуратура прыняла рашэнне, што «Мастоўдрэў» павінен выплаціць запазычанасці па заробках да 17 сакавіка 2009 года. Аднак тады ў завода не было сродкаў.

Зараз кіраўніцтва прадпрыемства ябцае, што запазычанасці будуць выплачаныя да 30 верасня 2009 года.

Еўрарадыё

## Цэх № 2 Мастоўскай сельгастэхнікі аднавіў працу

**На «Мастоўскай сельгастэхніцы» з 31 жніўня зачыніўся другі цэх па вытворчасці джгутоў і тэлефонных апаратаў №2, а каля 40 рабочых гэтага цэха кіраўніцтва прадпрыемства адправіла ў адпачынак за свой рахунак.**

Пасля таго, як пра гэтую сітуацыю напісалі мясцовыя і рэспубліканскія СМІ, цэх аднавіў працу 3 верасьня. За апошнія 10 месяцаў заробак на ДП "Мастоўская сельгастэхніка" зменшыўся ў 3 разы.

## Кожны чацвёрты жыхар Гарадзеншчыны карыстаецца інтэрнэтам

**"Кожны чацвёрты жыхар Гарадзенскай вобласці карыстаецца Інтэрнэтам,"- паведаміў 7 верасня журналістам дырэктар Гарадзенскага філіяла «Белтэлекама» Віктар Матвееў.**

У Гарадзенскай вобласці «Белтэлеком» налічвае ўжо больш 100 тыс. абанентаў Інтэрнэту. Гаворка ідзе аб кропках падключэння, і калі ўлічыць, што за кожнай кропкай стаяць 2-3 чалавекі, то можна лічыць, што Інтэрнэтам у рэгіёне карыстаюцца 250-300 тыс. чалавек, або кожны чацвёрты.

Як адзначыў Віктар Матвееў, «Белтэлекам», нягледзячы на тое, што шэраг яго паслуг (Wi-Fi, стацыянарная тэлефонная сувязь, радыёвяшчанне) не з'яўляюцца рэнтабельнымі і фінансуюцца за кошт крыжаванага субсідавання, стала зніжае кошты на доступ у Інтэрнэт. Так, у тарыфных планах «Плюс 1» і «Плюс 2» аб'ём уключанага трафіку з 1 верасня вырас удвая без змены кошту. Уведзеная таксама дыферэнцыяваная аплата за перавышэнне трафіку. Тарыфны план «Вечар» стаў удвая хутчэшы пры тым жа кошце. Акрамя



таго, распрацаваны новы тарыфны план "Сацыяльны", ён даступны для інвалідаў I групы, грамадзян з праблемамі апорна-рухальнага апарата і сем'яў, якія маюць дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў.

У Гарадзенскай вобласці дзейнічаюць 30 кропак бесправаднога доступу ў Інтэрнэт па тэхналогіі Wi-Fi, яшчэ шэсць новых будзе ўведзена да канца года. Такім чынам, 24 пункты Wi-Fi будуць працаваць у Гародні і 12 - у райцэнтрах. Як падкрэсліў прадстаўнік «Белтэлекама», Wi-Fi - гэта іміджавая для «Белтэлекома» і для Беларусі паслуга, і, нягледзячы на нерэнтабельнасць, яна будзе развівацца. Ужо хуткім часам у Гародні Wi-Fi прыйдзе ў студэнцкія інтэрнаты.

Белта

# Па нашым Выбарчым кодэксе можна праводзіць добрыя выбары, але не ў Беларусі

**Чаму ў Іране і Венесуэле кандыдат ад улады можа прайграць, а ў Беларусі — не? На якім этапе магчымыя фальсіфікацыі і чаму з 70 тысяч членаў выбаркамаў не знайшлося ніводнага, які б публічна заявіў пра парушэнні? І ці вырашаць змены ў Выбарчым кодэксе ўсе гэтыя праблемы?**

**На гэтыя пытанні адказвалі эксперты падчас круглага стала на тэму "Змены ў выбарчым заканадаўстве Беларусі". У дыскусіі прымалі ўдзел спецыяліст у галіне выбараў, юрыст Сяргей Альфер, старшыня Беларускага Хельсінскага камітэту, юрыст па адукацыі Алег Гулак і палітолаг Віталь Сіліцкі.**

*Апошнім часам вельмі актыўна абмяркоўваюцца змены ў выбарчым заканадаўстве. Давайце пагаворым пра тое, якія змены ўвогуле магчымыя, якія рэальныя, якія змены пажаданыя. Але пачнем з іншага. Ёсць такія краіны — Венесуэла, Іран. Іх ніяк не аднясеш да дэмакратычных краінаў. Пры гэтым Уга Чавес прайграе рэферэндум, а ў Іране кандыдат ад улады прайграе незразумела якому Ахмадзінежаду. Чым адрозніваецца Венесуэла ад Беларусі? Тым, што там была рэальная палітычная барацьба? Тым, што там ідэальнае выбарчае заканадаўства? Ці там самы сумленны старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі?*

**Альфер:** У Венесуэле іншая сістэма выбараў, там іншы выбарчы орган — гэта судовыя органы, якія з'яўляюцца ў пэўнай ступені незалежнымі ад дзяржавы. Верагоднасць фальсіфікацыі органамі гэтых выбараў — дастаткова нізкая. Таму падлік галасоў і на першым рэферэндуме, і на другім быў больш-менш справядлівы.

У Іране ўладу задавальнялі два кандыдаты. Таму першыя выбары Ахмадзінежада былі праведзеныя з поўным выкананнем выбарчага заканадаўства. І не было вялікай фальсіфікацыі.

*І што цікава — ні ў адной, ні ў другой краіне не было міжнародных назіральнікаў...*

**Альфер:** У пэўных краінах заканадаўства не прадугледжвае міжнароднага назірання. Няма міжнароднага назірання ў ЗША, няма ў Нямеччыне, няма ў Польшчы. Таму што краіны, якія лічаць сябе дэмакратычнымі і ў іх падлік галасоў праходзіць без фальсіфікацый, для іх запрашэнне міжнародных назіральнікаў будзе казаць пра тое, што яны паніжаюць узровень сваёй дэмакратыі.




**Гулак:** Факт застаецца фактам, пры ўсёй недэмакратычнасці Ірана і Венесуэлы палітычнае жыццё там нашмат больш развітае, чым у Беларусі.

Але калі мы гаворым пра Беларусь, тут пытанне не ў тым, ёсць парушэнні ці не. Пэўныя парушэнні могуць быць у любой краіне, і ў Злучаных Штатах. У Беларусі стаіць пытанне — ці ёсць выбары ў прынцыпе, ці можам мы ў прынцыпе гаварыць пра тое, што вынікам выбараў становіцца той чалавек, за якога людзі аддалі галасы.

**Сіліцкі:** І ці ёсць хоць нейкая рэальная палітычная канкурэнцыя.

*Якая галоўная прэтэнзія да нашага выбарчага заканадаўства?*

**Альфер:** АБСЕ вылучыла 7 патрабаванняў. Першае — выбарчыя камісіі павінны быць сфармаваныя такім чынам, каб пасля выбараў усе сказалі, што выбары прайшлі свабодна, адкрыта і волевыяўленне выбаршчыкаў было цалкам выражана ў канкрэтным выбарчым пратаколе.

Другое — агітацыйная кампанія. Сёння народ амаль не ведае пра сваіх кандыдатаў, таму што агітацыйную кампанію праводзіць без дазволу органаў улады немагчыма. Уявіце: адзін бок, які мае ўладавыя рычагі, не дазваляе апанентам праводзіць агітацыйную кампанію.

Трэцяе — падлік галасоў павінен быць праведзены такім чынам, каб кожны чалавек сказаў, што ён быў падлічаны справядліва. То бок — невялікая колькасць прэтэнзій, якая патрабуе змены вялікай колькасці артыкулаў Выбарчага кодэксу.

Але прычына не ў тым, што Выбарчы кодэкс недэмакратычны, дрэнны. Па гэтым Выбарчым кодэксе, калі б ён быў перанесены на глебу ў Вялікабрытанію, можна даць амаль 100% гарантыі, што па ім правялі б свабодныя і справядлівыя выбары. А ў Беларусі, паколькі Выбарчы кодэкс неканкрэтны, гэта дае магчымасць органам уладаў праводзіць выбары такім чынам, што яны могуць выдаць любы вынік, і даведацца пра гэты вынік немагчыма.

**Гулак:** Такім чынам, можна падсумаваць: Выбарчы кодэкс сам па сабе не найгоршы. Калі б была палітычная воля, можна было б праводзіць дастаткова неблагія выбары. Але ў нашай сітуацыі гэты Выбарчы кодэкс трэба, канечне, мяняць, таму што ён не стварае неабходных бар'ераў для парушэнняў. І механізмаў аднаўлення правоў і абскарджвання ён таксама не ўтрымлівае. Усё залежыць ад таго, якая палітычная воля ў сённяшняга кіраўніцтва.

*Як можна прымусіць выканаць працэдуры — зразумела. А вось як прымусіць палітычную волю праявіцца? На гэта цяжка паўплываць.*

**Гулак:** На цяжкія пытанні няма простых адказаў.

### "У Беларусі ў прынцыпе варта было б адмяніць датэрміновае галасаванне"

**Сіліцкі:** У краінах, дзе няма традыцыяў дэмакратыі і ёсць зафіксаваная гісторыя непразрыстых, фальсіфікаваных выбараў ці злоўжыванняў на выбарах, там уводзяцца дадатковыя страхавачныя механізмы...

*То бок, у Беларусі варта было б адмяніць датэрміновае галасаванне?*

**Сіліцкі:** Датэрміновае галасаванне — гэта абсалютна нармальная працэдура шмат у якіх краінах, напрыклад, у ЗША. Але там няма падазрэнняў, што ўначы ажыццяўляецца ўкід бюлетэняў у выбарчыя скрыні.

**Гулак:** Цікава, што ў стандартах АБСЕ па дэмакратычных выбарах не прапісана дэталёвых працэдур. Там гаворыцца пра прынцыповыя рэчы, што выбары павінны быць справядлівымі... Якім чынам гэта будзе ў кожнай краіне рэалізоўвацца — гэта ўжо пытанне тэхнічнае, і яно залежыць у тым ліку і ад сістэмы, якая склалася ў краіне.

Калі ў Швецыі людзі месяц датэрмінова галасуюць па пошце і ні ў каго гэта не выклікае спрэчак і сумневаў у дэмакратычнасці выбараў — але гэта не значыць, што падобныя тэхналогіі можна выкарыстаць у Беларусі. У нас, па вялікім рахунку, у сённяшняй сітуацыі ў прынцыпе варта было б адмяніць датэрміновае галасаванне.

**Альфер:** У нас адбываецца як — бяруцца бюлетэні, запакоўваюцца ў паперу і апячатваюцца пячаткай выбарчай камісіі. Пячаткі ва ўсіх участковых камісіях у Беларусі — аднолькавыя. На іх напісана "участковая выбарчая камісія".

**Сіліцкі:** То бок, не напісана якога раёну...

**Гулак:** Гэта тое ж самае, што заляпіць кавалкам пластыліну.

**Альфер:** Адкрыць, закрыць, замяніць — магчыма.

### "Выбарчая камісія — як растрэльная каманда: аднаму даюць незараджаную стрэльбу, каб было хоць нейкае маральнае апраўданне, што я, можа, не забіў..."

**Гулак:** Але нават у гэтых умовах камісіі не могуць нават сфальсіфікаваць па-людску. На жаль, мы сёння можам канстатаваць, што гэтая сістэма настолькі адвучылася працаваць, настолькі яны проста малююць лічбы і не займаюцца рэальным падлікам. Сістэма адвучылася рабіць нават больш-менш прыстойныя фальсіфікацыі.

*Добрыя словы — фальсіфікаваць па-людску... На якіх этапах звычайна адбываюцца фальсіфікацыі? Ці залежыць гэта ад віду выбараў? Навошта фальсіфікаваць ў камісіях, калі можна пасля ў Цэнтрвыбаркаме падлічыць-пералічыць?*

**Гулак:** Калі мы ўзгадаем парламенцкія выбары 2000 года, тады фальсіфікацыі адбываліся на асобных участках па акрузе. Па большасці ўчасткаў вёўся больш-менш нармальны падлік галасоў, і калі яны здавалі свае пратаколы ў акруговыя камісіі, тры-чатыры ўчасткі на акрузе відавочна атрымлівалі ўказанні, якія лічбы ім трэба зрабіць. Большасць участкаў працавала нармальна, а на гэтых участках рабілі тое, што трэба для выніку.

Зараз сістэма працуе намнога больш проста і эфектыўна. На большасці ўчасткаў падлік проста не вядзецца. На ўчастках, дзе 1500-2000 выбаршчыкаў, іх галасы падлічваюцца за 15 хвілін. Гэта тэхнічна немагчыма іх падлічыць за такі час.

Такаясістэмабудуеццанапоўнай заангажаванасці сяброў камісіі. Яны нават не фальсіфікуюць — яны проста падпісваюць тое, чаго не бачылі. Фальсіфікуе пара чалавек у камісіі. Астатнія падпісваюць тое, чаго не бачылі, і знаходзяць для сябе маральнае апраўданне, што мы ж нічога дрэннага не зрабілі. Чаму б нам не давяраць старшыні камісіі? Ён прынёс — мы падпісалі.

**Сіліцкі:** Сапраўды, вельмі тонкая сістэма. Гэта як у растрэльнай камандзе: аднаму даюць незараджаную стрэльбу, каб было хоць нейкае маральнае апраўданне, што я, можа, не забіў.

Немагчыма папракнуць таго ж старшыню Цэнтрвыбаркаму. Яна можа нават не ведаць рэальнай карціны...

**Альфер:** Фармальна сказаць, што Цэнтральная камісія па выбарах вінаватая ў фальсіфікацыях вынікаў выбараў — вельмі цяжка. Калі праходзяць мясцовыя альбо парламенцкія выбары, то за вынікі выбараў адказваюць акруговыя камісіі. Цэнтральная камісія толькі атрымлівае выніковыя пратаколы. І ўвогуле яе задача — арганізаваць саму працэдуру правядзення выбараў, якая арганізавана добра. Тут сказаць нельга, што працэдура правядзення выбараў праходзіць не ў адпаведнасці з законам. Яна праходзіць у поўнай адпаведнасці з законам.

### "Большасць сяброў камісіі — жанчыны. Нашыя жанчыны вельмі добра выконваюць працу, але не задаюць лішніх пытанняў"

*Колькі ўсяго у нас чалавек у выбарчых камісіях?*

**Гулак:** Ва ўчастковых выбарчых камісіях каля 70 тысяч чалавек.

*Вы хочаце сказаць, што 70 тысяч чалавек — і ніводнага не знайшлося, які б публічна заявіў, што штосьці тут не тое?*

**Гулак:** Не трэба забываць, што выбары адбываюцца ў атмасферы страха, якая выбудоўвалася дастаткова доўга і сур'ёзна. Да таго ж выбары ў краіне праходзяць па вытворчай прыкмеце — асобнымі прадпрыемствамі. Выканкам размяркоўвае, на якой тэрыторыі якое прадпрыемства адказвае за выбары. І яно адказвае не толькі за тэхнічнае забеспячэнне, але і за вынікі. Гэта значыць на кожным прадпрыемстве ёсць адмысловыя людзі, якія займаюцца кадравымі пытаннямі. Яны адсочваюць — каго можна ўключыць у камісію, хто не будзе задаваць лішніх пытанняў.

Працяг на стар. 4.



# Першыя прэзентацыі кнігі «Нацыянальнасць — беларус»

**20 і 21 ліпеня ў Бярозаўцы і Слоніме, Мастах і Ваўкавыску адбыліся прэзентацыі кнігі прафесара гісторыі Алега Латышонка «Нацыянальнасць — беларус».**

Грунтоўны збор на 588 старонках толькі выйшаў з друкарні і ўжо пачаў свой шлях да чытачоў прэзентацыямі на Гарадзеншчыне.

У райцэнтры Гродзенскай вобласці новую кнігу прывезлі аўтар, прафесар гісторыі Алег Латышонак і адказны за выпуск збору Валер Булгакаў.

Выданне распавядае пра сапраўдную гісторыю Беларусі. Кніга зьмяшчае ў сабе 4 раздзелы прысвечаныя паходжанню крывічоў і русаў, еўрапейскай сарматыі, паходжанню назвы «Беларусь», фармаванню беларускай мадэрнай нацыі.

Паводле аўтара кнігі, першай вядомай гістарычнай навуцы дэкларацыяй беларускасці з'яўляецца запіс Саламона Рысінскага пры паступленні ва ўніверсітэт у Альтдорфе ў 1586 годзе – Solomo Pantherus Leucorussus. Leucorussus – у перакладзе на беларускую азначае беларус.

Наталля БАРЫСЮК

# Па нашым Выбарчым кодэксе можна праводзіць добрыя выбары, але не ў Беларусі

Заканчэнне. Пачатак на стар. 3.

Плюс, большасць сяброў камісіі — жанчыны. Нашыя беларускія жанчыны адрозніваюцца тым, што яны вельмі добра выконваюць працу. Усё тэхнічна зроблена правільна і акуратна, але яны не задаюць лішніх пытанняў. Мае знаёмыя, прыстойныя людзі, былі сябрамі ўчастковых камісій. Я пытаюся: вось вы падлічвалі — і што? "Ну, я падлічыла свой кавалачак і перадала". А далей што? "Ну, гэта ўсё было так хутка...". Ты падпісала тое, чаго не бачыла? "Ну, гэта ўсё было так хутка".

Да таго ж людзі, якіх прывялі ў камісію, — яны ж на кантракце. Калі яны пачнуць задаваць лішнія пытанні, у іх узнікнуць пытанні з кантрактам.

Сёння ніхто не ведае рэальных вынікаў галасавання. Паколькі фальсіфікацыі адбываюцца на ўзроўні ўчастковых камісій, рэальных вынікаў галасавання ў краіне не ведае ніхто. Гэта сістэма камісій, і зроблена яна дзеля таго, каб цалкам кіраваць працэсам. З такімі камісіямі можна дабівацца любых вынікаў, якія неабходныя.

*Калі ўзгадаць прэзідэнцкія выбары 94-года, наколькі там па працэдурах усё адрознівалася? Тады ўвогуле не было Выбарчага кодэксу, яго на хаду прыдумлялі...*

**Альфер:** Па-першае, людзі не ведалі, як фальсіфікаваць выбары, па-другое, у народа не было такога панавання страху, як зараз.

У тыя выбары не было праблемаў з уключэннем прадстаўнікоў палітычных партый альбо прадстаўнікоў апазіцыі ў выбарчыя камісіі. Акруговыя камісіі, участковыя — ва ўсіх прадстаўнікі апазіцыйных структураў.

*У адпаведнасці з законам выбарчыя камісіі з'яўляюцца незалежнымі ад уладаў структурамі. Якім чынам можна выбарчую камісію зрабіць незалежнай?*

**Альфер:** Можна зрабіць, калі ў сябраў выбарчых камісій будзе плюралізм поглядаў. Калі погляды аднаго сябра выбарчай камісіі будуць адрознівацца ад іншага. Калі будуць прадстаўнікі іншых палітычных структур — як праўладавых, так і апазіцыйных.

*Дык а як гэта прапісаць у законе?*

**Альфер:** А закон у нас, дарэчы, вельмі цікавы. Закон у нас вельмі падрабязна рэгламентуе працэдуру вылучэння прадстаўнікоў выбарчых камісій — там да кропачкі ўсё прапісана, якім чынам, якая арганізацыя павінна вылучыць прадстаўнікоў. І абсалютна ў законе не прапісана працэдура, якім чынам органы, якія фармуюць выбарчую камісію, уключаюць гэтых сяброў. Вось яны атрымалі гэты спіс, і паводле свайго персанальнага асабістага меркавання і ўключаюць прадстаўнікоў выбарчай камісіі.

**Гулак:** Таму сёння вельмі важна дабівацца максімальнага пашырэння паўнамоцтваў назіральнікаў. Бо рэальна ўключыць людзей ва ўчасткова-тэрытарыяльныя камісіі дзеля таго, каб іх сфармаваць у такім плюралістычным выглядзе, — будзе вельмі складана. Без пашырэння паўнамоцтваў назіральнікаў,мы ўсё адно нічога не даб'емся.

Наста ІГНАТОВІЧ,
Еўрарадыё

# На 343 вучні зменшылася за год

**Калі ў 2008-2009 годзе ў школах і гімназі Мастоўскага раёну навучаліся 4517 вучняў, то ў гэтым годзе ў школу пайшлі толькі 4174.**

Звязана гэта са змяншэннем насельніцтва Мастоўскага раёна. Так, у 1995 годзе ў раёне жылі 43,9 тысячы чалавек, сёння ж — усяго каля 33 тысяч. Летась з-за недахопу вучняў зачынілася Радзевіцкая базавая школа, а ў Песках дзіцячы садок і школа ўтварылі адну навучальную установу.

Пры гэтым адзначаецца кепскае здароўе у дзяцей, якія яшчэ не пайшлі ў школу. 60% дзяцей у садках маюць II групу здароўя.

# Мастаўчанкі сталі «Людзьмі года»

**Упраўленне Белкаапсаюза і прэзідыўм Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафесійнага саюза працаўнікоў спажывецкай кааперацыі прысудзілі ўзнагароды «Чалавек 2008 года».**

Так намінацыю «Лепшы прадавец» атрымала Найда Ганна Віталеўна, прадавец з выкананнем абавязкаў загадчыка крамай «Мэбля» г. Масты прыватнага унітарнага прадпрыемства «Уніпром-Маркет» Мастоўскага райпо.

А «Лепшым тэхнолагам прамысловасці» стала Сіруць Таццяне Мікалаеўна, тэхнік-тэхнолаг 1-ай катэгорыі прыватнага унітарнага прадпрыемства «Мастоўскі кооппром» Мастоўскага райпо.

http://masty.belarda.org

# Кніга аб паветраных баях над Чарлёнай

**Напярэдадні 65-ых угодак вызвалення Беларусі выйшла ў свет кніга аспіранта факультэта гісторыі і сацыялогіі Гарадзенскага ўніверсітэта імя Я. Купалы Дзмітрыя Кіенка «Крылья над Гродно: боевые действия 127-ого истребительного полка».**

Пісьменнік-дакументаліст распавядае аб першых паветраных баях над вёскай Чарлёна (Мастоўскі раён), Гродна, Скідзелем,

Шчучынам, Лідай, возерам Юбілейнае, падчас якіх 127-й знішчальны полк страціў 12 лётчыкаў і 13 самалётаў.

Акрамя таго, кніга ўтрымоўвае карты, фатаграфіі лётчыкаў, замалёўкі самалётаў і іншыя дакументы.

Белта

# Крыхмальны завод пачне працу толькі ў канцы 2010

**Як ужо паведамляў наш партал з-за непрафісіяналізму праекціроўшчыкаў, якія няправільна выбралі месца для будоўлі, пераносіцца час увядзення ў эксплуатацыю новага крухмальнага заводу ў Мастоўскім раёне. Пачне працу ён толькі восенню 2010 года. Між тым, раней ка удавалася, што завод адкрыецца ў канцы гэтага года.**



Завод размесціцца ў Рагозніцы на плошчы ў 4-5 га, для яго ўжо набыта абсталяванне – шведская аўтаматызаваная лінія. Імпартовая тэхніка дазволіць вырабляць экструдыраваны мадыфікаваны крухмал, які пакуль ў Беларусі нідзе не вырабляецца. Ён мае вялікую вартасць і выкарыстоўваецца ў самых розных прамысловасцях – харчовай, картонна-папяровай, вытворчасці клею і інш. Да таго ж вытворчасць будзе практычна безадкіднай, бо розныя лішкавыя рэчывы будуць выкарыстоўвацца на корм жывёле, для вырабу клятчаткі, у якасці ўгнаення.

Плануецца, што падчас рэалізацыі гэтага імпартазамяшчальнага праекта будзе створана каля 20 дадатковых працоўных месцаў. Колькасць працоўных складзе да 65 чалавек. Да гэтага моманту бульбу на крухмал перапрацоўвае Рагозніцкі крухмальны завод, які заснаваны ў 1912 годзе. Зараз тут працуе 44 чалавекі. Плануецца, што паступова стары завод будзе выведзены з эксплуатацыі.

Белта



# Мастоўская «Рамантыка»

**Ужо 3 тыдні як ў Мастах адчыніў свае дзверы чарговы бар. Гэта не звычайны бар.Ён зусім непадобны на тыя бары і псеўдакавярні якія існуюць у нашым горадзе. Ды і назва ў яго рамантычная, ён так і называецца – «Рамантыка».**

Не маю нічога супраць нашых піцейных установаў, але ж многім з нас даводзілася, каму пад час адпачынку на моры, каму у студэнцкія гады ці ў замежнай вандроўцы наведваць сапраўдныя кавярні. Кавярні — выходзячы з якіх не пахнеш смажанымі катлетамі і цыгарэтным дымам.

На жаль, у Мастах вельмі складана выйсці з кавярні альбо бара і працягваць пахнуць парфумай. Ініцыятыва ў нас не вітаецца, гэта вядома, таму няма ні ўстановаў, ні канкурэнцыі паміж тымі ўстановамі.Да адкрыцця Рамантыкі, самай прыстойнай кавярняй была «Николла», гэта як на мой густ. А зараз ёсць «Рамантыка».Прасторная зала ў будынку на беразе Нёмана, побач з адкрытым у гонар 500 годдзя горада дэндрапаркам. Барная стойка ў чырвона шэрым каляровым аздабленні,мяккія канапы, добрае святло і музыка. Можна выпіць і патанцаваць.

Працуе бар — дыскатэка ў самы рамантычны час, з 21 гадзіны вечара да 4 раніцы. Тут можна паразмаўляць па душам і не думаць, што хутка праб'е 12 і папялушка ператворыцца ў гарбуз. Карацей, ніякага напружання. Размаўляй, выпівай і танцуй. А што яшчэ трэба пасля працоўнага напружанага тыдня? Адпрацаваўшы пяцідзёнку хочацца разрадкі. Пасядзець з сябрамі ды паразмаўляць, абмеркаваць апошнія навіны і проста паразмаўляць па душам. Хтосьці гэта робіць дома, хтосьці пад час вячэрняга піва пасля лазні, хтосьці ідзе ў «Рамантыку».

Пакуль я не каштаваў страваў якія падаюць у рамантыцы, не піў піва якое тамналіваюць. Пакуль не даявлося, бо ані часу ані нагоды не было. Усё ж такі водгукі знаёмых, пра мастоўскую Рамантыку пакуль нядрэнныя.

Застаецца спадзявацца, што гэтая ўстанова будзе трымаць узровень і не апусціцца да ўзроўню нашумелай «Купалінкі» ці калгаснай «Рыўеры».

**Міраслаў Рудалевіч**

# Радыё Свабода пра «Рэгіянальны партал Мастоў»

**Працягваем аглядаць сайты беларускага інтэрнэту. Сёньня я вырашыў паглядзець, што робіцца ў рэгіянальных навінах.**

Трэба сказаць, што само слова «рэгіянальны» выклікае ў некаторых онлайнавых чытачоў, асабліва зь ліку жыхароў сталіцы, асацыяцыі зь нечым другасным, правінцыйным, дужа лякальным ды нецікавым. Мушу прызнацца, што я і сам не выключэньне зь ліку тых, хто хварэе на менскі ізаляцыянізм. Доўгі час я абмінаў рэгіянальныя сайты, як ня вартыя ўвагі. Маўляў, ну што я там магу прачытаць — пра чарговыя дасягненьні мясцовых даярак ды мэханізатараў на афіцыйных сайтах ці пра такія ж грандыёзныя посьпехі тамтэйшых актывістаў апазыцыі? Але ж на рэгіянальных сайтах ёсьць шмат рознай нязвыклай і карыснай інфармацыі. Тое, за чым ганяецца бульварная прэса, калі піша пра розныя дзіўныя здарэньні ды нязвыклыя жыцьцёвыя сытуацыі, адбываецца якраз у правінцыі. Дарэчы, буйныя навінавыя парталы гэта ведаюць і часта выкарыстоўваюць такія паведамленьні на сваіх цэнтральных старонках.

Але калі ўжо казаць пра цалкам беларускамоўны рэгіянальны сайт, які варта адзначыць як па лінгвістычнай прыкмеце, так і па ўнівэрсальнасьці кантэнту (цікавага ня толькі для мясцовых чытачоў), то на першае месца я б паставіў«Рэгіянальны партал Масты», які знаходзіцца па адрасе http://masty.belarda.org Папершае, я не знайшоў там ніводнай навіны па-расейску: нават калі матэрыял не арыгінальны, а перадрукоўка, ён усё адно падаецца па-беларуску. Недахоп уласных навінаў тут кампэнсуецца ўдала падабраным дайджэстам, таму ўзьнятыя на мастоўскім сайце тэмы будуць аднолькава цікавыя чытачам з розных куткоў Беларусі.Пры гэтым мастоўскі сайт знаходзіцца пад адным дахам з тузінам іншых «рэгіянальных парталаў» у складзе цэнтральнага праекту Belarda.org. Таму тут вельмі лёгка параўнаць сайты розных рэгіёнаў.

# Калі Беларусь хоча дамагчыся поспеху, то павінна прыбраць усе перашкоды

**Калі Беларусь хоча дамагчыся поспеху, то павінна прыбраць усе перашкоды, заявіў у інтэрв'ю БелаПАН амерыканскі бізнес-кансультант, аўтар больш чым дзесятка кніг па маркетынгу Джэк Траут.**

Паводле слоў Траута, для пазіцыянавання краіны «ўсё роўна, адкуль вы і кім былі; важна, да чаго імкнецеся, над чым працуеце». Калі беларускія ўлады зацікаўленыя ў развіцці эканомікі і прыцягненні інвестараў, то павінны правесці неабходныя рэформы, каб выкараніць бюракратыю, заявіў маркетолаг. Ён прывёў у прыклад Кітай, дзе інвестараў «сустракаюць у аэрапорце на «ролс-ройсе», вязуць непасрэдна да міністра, той толькі запытвае, што ім трэба — і яны гэта атрымліваюць». Пры гэтым Траут адзначыў, што «ад бюракратыі вельмі, вельмі складана пазбавіцца».

Бізнес-кансультант лічыць, што Беларусь для ўсяго свету — гэта «тэра інкогніта». Вам трэба вырашыць, што расказаць пра краіну, як яе паднесці. У кожнай краіны ёсць што «прадаць» і ў галіне эканомікі, і ў галіне турызму, — сказаў Траут.

Паводле меркавання амерыканскага спецыяліста, плануючы рэкламную кампанію для краіны, да яе можна «ставіцца як да прадукту, але кіраваць ёю як кампаніяй». Пры гэтым ён адзначыў, што аднолькавую важнасць мае якасць «прадукту» і рэкламнай кампаніі. Але прадукт першасны сам па сабе, <...> нельга прадаваць адсутнасць прадукцыі або паслуг, — заявіў ён.

Траут паведаміў, што перад паездкай у Менск з ім звязваліся прадстаўнікі Міністэрства эканомікі, каб дамовіцца аб сустрэчы. Нягледзячы на яго згоду сустрэцца, з ім на сувязь больш не выйшлі, паведамляе БелаПАН.

# Малому бізнесу акажуць падтрымку пры рэалізацыі беларускіх тавараў

**У Беларусі вырашана стварыць рабочую групу для аператыўнага аналізу сітуацыі, выпрацоўкі мер і аказання суб'ектам малога прадпрымальніцтва падтрымкі па рэалізацыі беларускіх тавараў на ўнутраным і знешнім рынках. Гэта прадугледжана распараджэннем прэм'ер-міністра Беларусі нумар 92р, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе Мінэканомікі.**

Асноўная задача дзейнасці рабочай групы - арганізацыя пастаяннай сістэмнай работы дзяржаўных органаў і арганізацый па вырашэнні праблемных пытанняў, звязаных з актывізацыяй прыцягнення суб'ектаў прадпрымальніцтва да рэалізацыі тавараў айчыннай вытворчасці, а таксама наладжванне ўзаемадзеяння паміж арганізацыямі-вытворцамі і суб'ектамі малога прадпрымальніцтва па пытаннях набыцця тавараў айчыннай вытворчасці, - гаворыцца ў прэс-рэлізе.

У склад рабочай групы ўключаны кіруючыя работнікі органаў дзяржкіравання, адказныя ў рамках курыруемых напрамкаў за правядзенне работы, звязанай з прыцягненнем суб'ектаў малога бізнесу да рэалізацыі тавараў айчыннай вытворчасці на ўнутраным і знешнім рынках, а таксама прадстаўнікі аб'яднанняў (асацыяцый і саюзаў) суб'ектаў прадпрымальніцтва.

Дзейнасць рабочай групы ўзначальвае дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтву Міністэрства эканомікі Аляксандр Ліхачэўскі, паведамляе БЕЛТА.

# ЗША ўводзяць аплату за ўезд еўрапейцаў у краіну

**Амерыканскі Сенат зацвердзіў рашэнне пра ўвядзенне аплаты за ўезд у ЗША грамадзян краін, з якімі Штаты маюць бязвізавы рэжым. «За» прагаласавалі 79 сенатараў, супраць былі 19. У прыватнасці, гэтае рашэнне датычыць ЕС, які выступіў з асуджэннем гэтых планаў.**

Аплата складае 10 долараў з асобы. Атрыманыя ад збораў сродкі будуць пералічвацца ў фонд Таварыства спрыяння турызму.

Праект дакумента павінен яшчэ прайсці працэдуру зацвярджэння ў Палаце прадстаўнікоў Кангрэса ЗША, адзначае «Нямецкая хваля».

Агенцтва dpa нагадвае, што новаўвядзенне закране 29 еўрапейскіх краін, якія заключылі з ЗША дамову Visa-Waiver. У адпаведнасці з ёй грамадзяне гэтых дзяржаваў могуць знаходзіцца ў Злучаных Штатах без візы тэрмінам да 90 дзён.

# У Беларусі зафіксавана зніжэнне ВУП на 0,5%

**У Беларусі ўпершыню за многія гады зафіксавана зніжэнне валавога ўнутранага прадукту.**

Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у студзені—жніўні гэтага года ў адносінах да аналагічнага перыяду 2008 года ВУП скараціўся на 0,5%.У папярэднія месяцы 2009 года афіцыйная статыстыка адзначала невялікі прырост ВУП: у студзені — на 2,6%, студзені—лютым — на 1,2%, студзені—сакавіку — на 1,1%, студзені—красавіку — на 1,2%, студзені—маі — на 1,4%, студзені—чэрвені — на 0,3%, студзені—ліпені — на 0,4%.

Беларускі ВУП рос з другой паловы 90-х гадоў. Калі ў 1995 годзе было зафіксавана падзенне на 10,4%, то ў 1996-м — рост на 2,8%, у 1997-м — на 11,4%, у 1998-м — на 8,3%, у 1999-м — на 3,4%, у 2000-м — на 5,8%, у 2001-м — на 4,7%, у 2002-м — на 5%, у 2003-м — на 7%, у 2004-м — на 11,4%, у 2005-м — на 9,4%, у 2006-м — на 10%, у 2007-м — на 8,6%, у 2008-м — на 10%.

Паводле прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2009 год запланаваны прырост ВУП на 10—12%. Міжнародны валютны фонд у чэрвені прагназаваў падзенне ВУП па выніках года на 3,3%. Міністэрства эканомікі прагназуе рост на 1—2%.

Аб'ём прамысловай вытворчасці ў студзені—жніўні скараціўся на 4,6% (гадавы прагноз — рост на 10—12%), вытворчасць спажывецкіх тавараў — на 0,7% (рост на 12—13%). Пры гэтым выпуск харчовых тавараў павялічыўся на 5,4% (12—13%), нехарчовых — знізіўся на 7,5% (рост на 11,5—12,5%).

Выпуск сельскагаспадарчай прадукцыі гаспадаркамі ўсіх катэгорый уласнасці за восем месяцаў гэтага года павялічыўся на 3,3% (8,5—9,5%).

Аб'ём інвестыцый у асноўны капітал узрос на 16,9% (23—25%). Уведзена ў эксплуатацыю 3 млн. 524,3 тыс. кв. м жылля, або на 14,8% больш.

Перавозкі грузаў скараціліся на 7,1%. Рознічны тавараабарот узрос на 2,7% (прагноз — 16—17%), паведамляе БелаПАН.



# З-за свінога грыпу еўрапейцам рэкамендуюць не цалавацца

**У Францыі, Іспаніі і шэрагу іншых еўрапейскіх краін вітаць сваякоў, сяброў, калегаў лёгкім пацалункам у шчаку – частка штодзённага жыцця. Але цяпер гэтая традыцыя ў небяспецы з-за эпідэміі свінога грыпу**

У Францыі вітанне пацалункам у шчаку нагэтулькі важная частка культуры, што нават мае сваю назву... "ля біс" ('la bise').

Але французскае міністэрства аховы здароўя, на старонцы свайго сайту, прысвечанай пандэміі свінога грыпу, рэкамендуе пазбягаць "усіх простых кантактаў паміж людзьмі і асабліва з хворымі: не цалавацца і не паціскаць рукі".

Тыдзень таму ў Іспаніі распачалася кампанія Міністэрства аховы здароўя. Іспанцам рэкамендуюць часта мыць рукі, кашляючы альбо чхаючы, карыстацца сурвэткай альбо насоўкай і... пазбягаць пацалункаў.

У Іспаніі адна з найбольшых у Еўропе колькасць захворванняў на свіны грып. Каля дваццаці чалавек ужо памерлі, а 10 тысяч чалавек захварэюць штотыдзень.

Каталіцкая царква таксама выдала некалькі папярэджанняў. Вернікам рэкамендавана не цалаваць статуі Дзевы Марыі ў часе рэлігійных фэстаў. Некаторыя цэрквы спустошылі царкоўныя чашы, каб апярэдзіць распаўсюджанне вірусу. Каталіцкая царква і муніцыпальныя ўлады італьйскага горада Неапаль забаранілі цалаванне бутэлькі з крывёю святога Джэнара, ахоўніка горада Неапаль.

Але ж ніхто з тых, каго апытала Еўрарадыё, не выразіў жадання кінуць старадаўнюю культурную традыцыю цалаваць блізкіх і знаёмых.

Турыстычны гід з іспанскага гораду Сан-Себасцян Крысціна Кон'яй: "Гэта проста пастанова іспанскага ўраду, з той мэтай каб запабегчы пераносу інфекцыі грыпу... Гэта вельмі ўкаранёная ў нас традыцыя, цалавацца пры сустрэчы, а калі закаханы, цалаваць у вусны".

Негледзячы на рэкамендацыю ўрада, з ўсёй Францыі толькі мэр маленькага горада Гілвінэ забараніў "ля біс" у школах.

Крысціна Кон'яй: "Думаю, што іспанцы зараз не будуць паводзіцца згодна з гэтай рэкамендацыяй. Мы будзем і далей цалавацца, ціснуць рукі, не заўсёды будзем карыстацца насоўкай, бо мы носім насоўкі ў кішэні, дый часта проста няма часу іх даставаць".

Нават сама іспанская старшынька міністэрства аховы здароўя Трынідад Хімэнэс не стала кіравацца сваёй уласнай парадай, двойчы пацалаваўшы ў шчаку асістэнтаў канферэнцыі, перад тым, каб папярэдзіць грамадзянаў аб заходах супраць небяспечанага віруса.

**Аляксей Сарока, Еўрарадыё**



# Летуценнікі з праспекта Міра

**У Мастах даюць імёны дамам і робяць бегемотаў з дрэва**

У гэтым горадзе знаходзіцца адзіны дзейсны падвесны мост у Беларусі. Тут жа размешчаны і самы кароткі праспект краіны – праспект Міра, на якім дамам прысвоеныя толькі цотныя нумары. «Вячорка» працягвае падарожнічаць па Гарадзеншчыне. У гэты раз мы адправіліся ў Масты.

## Будуюць «разумнае» жыллё

Вакол праспекта Міра хутка разгорнецца будаўніцтва мікраараёна Мірны-1, разлічанага на чатыры тысячы жыхароў. Цяпер рыхтуецца праектная дакументацыя і каштарысы.

Гараджане збіраюцца ў кааператывы і даюць імёны сваім дамам. «Мара», «Мастаўчанін» і «Снежань» ужо заселеныя, хутка пачнецца будаўніцтва «Сям'і» і «Поспеху». У кожнага дома ёсць асаблівасці пад стаць назве. Да прыкладу, у «Мары» кватэры індывідуальнай планіроўкі, самая вялікая займае сто квадратных метраў. Амаль усё будынкі будуюць па праектах менскіх архітэктараў, гарадзенскія не спраўляюцца з наплывам замоў. Сталічныя праектоўнікі прадугледжваюць усталёўку на кожным паверсе адмысловых жалезабетонных маналітных паясоў, якія на выпадак стыхійнага бедства зберагуць дом ад абвальвання. Таксама яны выкарыстаюць больш трывалыя і даражэйшыя матэрыялы, да прыкладу замяняюць керамічнай сілікатную цаглiну. «Яна, вядома, больш трывалая, але і даражэйшая, а гэта адаб'ецца на кошце кватэры», – заўважыў прараб МПМК-155 Уладзімір Ісачанка.

Цяпер тут узводзяць пяціпавярхоўку на шэсцьдзесят кватэр «Гаспадар-2007». Галоўная асаблівасць дому – індывідуальнае цеплазабеспячэнне. У кожнай кватэры на кухні ўсталююць асобны газавы ацяпляльны апарат, які будзе награваць ваду, а таксама саграваць жыллё. Дзякуючы яму можна рэгуляваць узровень падачы цеплыні ў кватэры, тут ніколі не адключаць гарачую ваду. Да канца года сюды заселяцца маладыя сем'і. Квадратны метр папярэдне пацягне на мільён семсот – мільён восемсот тысяч рублёў.

## Паставяць лаўку – шчупака

У мастоўскім ЖКГ завялі асобную пасаду: вытворца мастацкіх вырабаў. Кіраўнік арганізацыі знайшоў прафесійнага разьбяра па дрэве з залатымі рукамі і запрасіў яго на працу. Зараз Уладзімір Епанчынцаў робіць упрыгожванні для ўсяго горада. Ён ужо выразаў для вулічнага дэкору бегемота, лясуна, некалькі грыбоў, арэлі ў выглядзе марскіх канькоў, пальмы, Бураціна і чарапаху, старадаўнюю студню. Цяпер ён рыхтуе лаўку ў выглядзе шчупака, улетку яе паставяць у гарадскім парку.

У ЖКГ спадзяюцца, што незвычайныя фігуры не знясуць спрытныя жыхары. У цэнтры горада не зрываюць нават ружы. А вось ірысы і аксаміткі, што растуць каля чыгуначнага вакзала, высаджвалі зноўку некалькі разоў, як распавяла майстар добраўпарадкавання РУП Мастоўскае ЖКГ Таццяна Грыцюк. Да Дня Незалежнасці ў цэнтры горада выставяць падвесныя кошыкі з кветкамі, высадзяць ядловец, абновяць кветнік каля помніка старэйшаму сяржанту Васілю Жукаву.

Па назіраннях мясцовых жыхароў, сёлета на дарогах паменшылася ровараў, а машын стала ў некалькі разоў больш. Мастаўчане сталі часцей ездзіць па прадукты і вопратку на гарадзенскія рынкі, зацікавіліся і новым гіпермаркетам.

Хоць на мясцовым рынку мяса прадаюць танней, чым у нас. Да прыкладу, свініну або ялавічную выразку аддаюць па пятнаццаць тысяч за кілаграм. Паляндвіцу хека аддаюць за семнаццаць з паловай. А вось кроп з шчыпарамі цыбулі у Гародні танней на дзвесце рублёў.

**Вячэрні Гродна**

# Аўтастаянка ў Мастах не патрэбная?

**1 ліпеня па вуліцы Будаўнікоў пачала працу ахоўваемая аўтастаянка на 100 месцаў. Прайшло ўжо больш за 2 месяцы і час падвесці першыя вынікі яе працы і патрэбнасці нашаму гораду.**



На сённяшні дзень на аўтастаянцы знаходзяцца 6 пастаянных аўтамашын. Яшчэ 120 аўта «начавалі» па адной ці некалькі начэй. Не густа. І гэта пры тым, што ў будучым планавалася павялічыць колькасць месцаў на стаянцы.

У сувязі з гэтым паўстае пытанне: «А ці была ўвогуле патрэбная ахоўваемая аўтастаянка ў Мастах?».

# Мабільнікі для пэнсіянэраў ад сельгатэхнікі

**У адным з цэхаў Мастоўскай сельгастэхнікі сабралі досьледную партыю мабільных тэлефонаў для пэнсіянэраў. Дырэктар прадпрыемства спадзяецца, што ў бліжэйшыя месяцы іх тэлефоны могуць зьявіцца на рынку.**



Са слоў дырэктара прадпрыемства Мікалая Лісая, праект стварэньня мабільных тэлефонаў для пэнсіянэраў рэалізуецца сумесна зь менскімі партнэрамі.

Зь яго слоў, яны не спрабуюць канкураваць зь вядомымі сусьветнымі брэндамі кшталту «Nokia», але лічаць, што нішу сваю знайшлі.

Даволі часта, са слоў дырэктара, сталыя людзі ня могуць націснуць на нязручныя кнопкі на тэлефоне альбо выпадкова яго блякуюць, а потым не даюць рады ўключыць:

«Вось так і нарадзілася ідэя стварыць найпрасьцейшы тэлефон зь мінімумам функцый, каб проста было карыстацца, каб быў даступны паводле кошту, а яшчэ там прадугледжваецца кнопка «SOS». Мы выбралі невялікую колькасьць функцый, самых патрэбных для сталага чалавека».

Спадар Лісай баіцца апярэдзіць падзеі і кажа, што пакуль тэлефон знаходзіцца на стадыі ўзгадненьня тэхнічных умоваў. Аднак на маё пытаньне — калі распачнецца выпуск — адказвае:

«Калі ўсё будзе добра, то напрыканцы верасьня альбо ўжо даклад на ў лістападзе тэлефон зьявіцца».

Больш пэсымістычна на тэрміны сэрыйнага выпуску тэлефона глядзіць начальнік вытворчасці цэху Сяргей Міцкевіч:

«Ведаеце, вельмі цяжка казаць пратэрміны.Тутізьфінансаваньнем праблемы, і тэхнічныя праблемы, шмат нюансаў. Карацей, хапае ўсяго».

І дырэктар, і начальнік вытворчасці цэху кажуць, што сытуацыя на прадпрыемстве ўскладнілася з крызісам. Са слоў спадара Міцкевіча, у цэху выпускаюць прадукцыю для айчынных прадпрыемстваў машынабудаваньня, і калі іх вытворчасьць зьнізілася, гэта адбілася і на працы цэху.

Міцкевіч: «Аб'ёмы вытворчасці ў параўнаньні зь мінулым годам зьнізіліся прыкладна на 30%».

Абодва кіраўнікі, аднак, пасьпяшаліся абвергнуць інфармацыю, якая зьявілася ў шэрагу СМІ, пра закрыцьцё на прадпрыемстве 31 жніўня цэху № 2 па вытворчасці жгутоў і тэлефонных апаратаў і звальненьні рабочых, у сувязі з чым нібыта праект вытворчасці мабільных тэлефонаў для пэнсіянэраў згорнуты.

Тым не меней за апошнія месяцы зарплата ў цэху адчувальна зьнізілася, хаця яшчэ яна складала каля мільёна рублёў.

Гісторыя цэху Мастоўскай сельгастэхнікі па выпуску жгутоў і тэлефонаў пачынаецца з 1988 году, калі была наладжана кааперацыя зь менскім прадпрыемствам вылічальнай тэхнікі імя Арджанікідзэ. Мастоўскі цэх наладзіў выпуск кабельна-жгутавых вырабаў для ЭВМ.

На пачатку 90-х гадоў, калі патрэба ў савецкіх ЭВМ адпала, цэх наладзіў кааперацыю са шчучынскім заводам «Аўтапровад» па выпуску аўтамабільных жгутоў.

У сярэдзіне 90-х гадоў з рэалізацыяй аўтамабільных жгутоў узьніклі праблемы, і цэх наладзіў новую вытворчасьць: выпуск стацыянарных тэлефонных апаратаў маркі Fetap, «Тэлпінг ЕС», «Еўратэф», «Люкс», якія вырабляе і дагэтуль.

У апошнія гады значным партнэрам мастоўскага цэху стала прадпрыемства «Белкамунмаш», для якога ў Мастах распачалі выпуск кабельных жгутоў.

І самым апошнім праектам Мастоўскай сельгастэхнікі стала распрацоўка мабільнага тэлефона для пэнсіянэраў.

Радыё Свабода

Мінск, 14 лістапада

## Еўрапейскі Саюз - наша будучыня!

## Беларускі Еўрапейскі Форум

**Беларускі Еўрапейскі Форум – гэта ўнікальная інфарамацыйна-дыскусійная пляцоўка па пытаннях супрацоўніцтва Беларусі і Еўрапейскага Звязу. Гэта дыялог, удзел у якім можа ўзяць любы грамадзянін Беларусі: падзяліцца сваім бачаннем і даведацца пра меркаванне вядомых асобаў Беларусі і Еўропы.**

Крызісныя з'явы ў дзяржаўнай сацыяльна-эканамічнай мадэлі, нестабільнасць стасункаў з Расіяй падштурхнулі ўлады да супрацоўніцтва з Еўрапейскім Звязам. Сёння мы бліжэй чым калі да змены геапалітычнага выбару Беларусі. Але толькі пры актыўным удзеле кожнага грамадзяніна Беларусі, падтрымцы з боку грамадзянскай супольнасці, пры палітычным плюралізме намаганні Еўрапейскага Звязу па вяртанні Беларусі ў еўрапейскую сям'ю дадуць плён.

Мэта Беларускага Еўрапейскага Форуму – падтрымаць паварот Беларусі ў бок Еўрапейскага Звязу, зрабіць незваротнымі працэсы еўрапеізацыі Беларусі, мабілізаваць прыхільнікаў і аб'яднаць патэнцыял беларускіх праеўрапейскіх сілаў.

Старшынёй арганізацыйнага камітэту па падрыхтоўцы да Беларуска - Еўрапейскага Форуму абраны лідэр праваабаронча – асветніцкага грамадскага аб'яднання "Рух" За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч.

У Мастах сход па вылучэнню дэлегатаў на Беларуска – Еўрапейскі Форум адбудзецца 2 кастрычніка 2009 года. Запрашаюцца ўсе зацікаўленыя.

Больш падрабязную інфармацыю пра Беларускі – Еўрапейскі Форум Вы можаце атрымаць патэлефанаваўшы па нумару + 375 29 155 88 93 (Аляксандр).

# Страхаўшчыкі за сем месяцаў сабралі 616,6 млрд. рублёў

**За студзень—ліпень 2009 года страхавымі арганізацыямі Беларусі атрымана страхавых узносаў на 616, 6 млрд. рублёў. Прырост паступленняў у параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам склаў 81,5 млрд. рублёў, ці 15,2%.**

Як паведамляе Міністэрства фінансаў, па добраахвотных відах страхавання атрымана страхавых узносаў у памеры 290,5 млрд. рублёў. Удзельная вага добраахвотных відаў страхавання ў агульнай суме паступленняў складае 47,1%. Па абавязковых відах страхавання атрымана страхавых узносаў 326,1 млрд. рублёў. Удзельная вага абавязковых відаў страхавання ў агульнай суме паступленняў складае 52,9%.

Выплаты страхавога кампенсавання і страхавога забеспячэння ў цэлым па рэспубліцы склалі 336,7 млрд. рублёў. Узровень страхавых выплат у агульнай суме атрыманых страхавых узносаў за студзень—ліпень склаў 54,6%, паведамляе БелаПАН

# Правінцыя трыццаць гадоў без гарачай вады

**У такім стане апынуліся жыхары 40-кватэрнага дома па вул. Будаўнікоў, 16 у Мастах Гродзенскай вобласці.**

Дом заселены ў 82-м годзе мінулага стагоддзя. Заказчыкам выступіла ўпраўленне капітальнага будаўніцтва райсавета. Каб зэканоміць дзяржаўныя грошы, быў утвораны будаўнічы кааператыў "Вулей". Будучыя жыхары аплацілі не толькі пабудову дома, але і падвод камунікацый, у тым ліку ўнутрыдамавую разводку гарачага водазабеспячэння. Засяліліся, а гарачай вады няма. Аднак, дабрабыт таго патрабуе. Часова сітуацыю вырашылі наступным чынам: усталявалі газавыя воданагравальныя калонкі. Так многія жыльцы дома забяспечвалі сябе гарачай вадой болей за дзесяць гадоў; некаторыя, хто жыве на верхніх паверхах, паколькі ціск вады слабы, грэлі яе ў каструлях, каб пазбегнуць газавага выбуху.

У другой палове 90-х гадоў газавая служба РБ прыняла новыя стандарты ўтрымання грамадзянамі газавых калонак. У гэтым доме не адна з іх не адпавядала стандарту і таму ўсе былі адключаны. Сітуацыя паглыблялася яшчэ тым, што цеплатраса мела доўгую працягласць ад кацельні ААТ "Мастоўдрэў" і дом быў падключаны да разводкі СШ №5 ды дзіцячага садка. Зімой было холадна усім – дарослым і дзецям, таму школу і садок пераключылі да бліжэйшай кацельні «Сельгастэхнікі,» а жыхары дома засталіся надалей ўзімку мерзнуць. Абураныя грамадзяне на чале са старшынёй кааператыва Валерам Палішэвічам, пачынаючы з 2001 г., пачалі перапіску з мясцовай уладай, у якой патрабавалі станоўчага вырашэння пытання цепла- і гарачага водазабеспячэння дома. Першы адказ, які атрымалі кааператыўшчыкі ад райвыканкама за подпісам намесніка старшыні Алены Кір'янавай, быў такі: сістэма вашага цеплазабяспечэння знаходзіцца ў задавальняльным стане; магчымы варыянт гарачага вадазабяспячэння, шляхам устаноўкі ваданагравальніка ў падвале дома, аднак ўнутрыдамавая разводка гарачага вадазабяспячэння выканана болей за 15 гадоў назад, таму неабходна скласці праект і правесці яе абследаванне. Жыхарам было прапанавана звярнуцца да спецыялістаў "Гроднаграмадзянпраект", якія выконваюць падобныя работы, але іх паслугі платныя. Калі першы этап работы будзе выканаын, то надалей адбудзецца вызначэнне кропкі падключэння теплазабяспячэння, замоўлены праект, сметная дакументацыя і вызначаны аснаўныя работы па пераключэнні трасы. І ўсё гэта за кошт жыльцоў.

У 2005 годзе, каб у кватэрах было цёпла, людзі заплацілі за матэрыялы і працу мясцовай арганізацыі па пераключэнні цеплазабеспячэння іх дома да кацельні райаграпрамтэхнікі.

Пытанне гарачага водазабяспячэння і сёння кожны вырашае самастойна. Жыхары апошняга паверха грэюць ваду ў каструлях, тыя, хто ніжэй усталявалі ўласныя воданагравальнікі і не жадаюць плаціць за агульны. Некаторыя зноў нелегальна падключылі газавыя калонкі.

Як былая так і цяперашняя ўлада прымушае выжываць людзей ды не жадае спрыяць ім. Таму жыхары дома 16 па вуліцы Будаўнікоў звярнуліся ў рэдакцыю газеты "Новага час", як апошнюю інстанцыю, прадставіўшы дакументальныя звесткі ашуканства іх ад пачатку будаўніцтва дома да фармальных адпісак сёння, каб засведчыць сваю праблему грамадскасці.

Самае недарэчнае ў гэтай гісторыі тое, што ў доме жыве пяць кіраўнікоў раённых арганізацый і яны не могуць свае элементарныя пабытовыя пытанні вырашыць цывілізавана.

А хто тады іх вырашыць?!

Язэп ПАЛУБЯТКА

АБ'ЯВА

**З 1 ліпеня пачала функцыянаваць часовая ахоўваемая аўтастаянка на 100 месцаў па вул. Будаўнікоў.**

Кошты паркоўкі (у разліку за месяц):

- легкавы аўтамабіль 76503 рублі;
- мікрааўтобус 87550 рублёў;
- грузавы аўтамабіль да 3,5 тонн 103 470 рублёў;
- прыцэп дзвухвосны 75 770 рублёў;
- матацыкл з каляскай альбо прыцэп аднавосны 33 110 рублёў;
- матацыкл, матаролер 16 650 рублёў;
- мапед 6 690 рублёў;

Пры заключэнні дамовы прадстаўляюцца зніжкі:

На 3 месяцы - 10%

На 3-6 месяцаў - 20 %

На 6-9 месяцаў - 30 %

На 1 год - 35 %

## Увага. Конкурс

Мастоўскі райвыканкам і ЦБУ №415 ААТ «АСБ Беларусбанк» г. Масты аб'яўляюць акцыю па павелічэнні безнаяўных разлікаў з выкарыстаннем пластыкавых банкаўскіх картак!

У перыяд з 01.08.2009 г. па 31.09.2009 г разлічваючыся пластыкавай карткай любога банка з магнітнай паласой у прадпрыемствах гандлю і сэрвісу, дзе ўсталявана тэрмінальнае абсталяванне «Беларусбанка»:

— крамах №1, №9, «Верас», «Архідэя», «Лаванда», «Фантазія», «Эўрыка-Груп», «Пачастунак з Ваўкавыска»,

— за нафтапрадукты на аўтазаправачнай станцыі;

—за паслугі «Белтэлекома»;

—за бытавую тэхніку ў краме «Дом тэхнікі»,

— інфакіёсках, банкаматах, тэрміналах «Беларусбанка» па аплаце камунальных і іншых плацяжоў, аплаце крэдытаў, пераводзе сродкаў і г.д.

Вы можаце стаць уладальнікам мабільнага тэлефона або электрычнага чайніка.

Кліенту, які ажжыццявіць найбольшую колькасць аперацый, будзе ўручаны мабільны тэлефон «Соні Эрыксан 250», прадстаўлены гандлёвым цэнтрам «Дом тэхнікі».

За найбольшы аб'ём па суме аперацый будзе ўручаны электрычны імбрычак «Атлант», прадстаўлены Мастоўскім райпо.

Вызначэнне пераможцаў будзе праводзіцца на падставе прад'яўленых уладальнікамі пластыкавых картак чэкаў аб здзейсненых аперацыях, якія будуць прымацца ў кабінеце №313 Мастоўскага райвыканкама з 1 да 9 кастрычніка 2009 г. з 9.00 да 12.00.

Усе неабходныя кансультацыі можна атрымаць па тэлефонах: 3-28-91 і 3-33-78.

# Пяткевіч наведала Масты

**У чэрвені ў 8 раёнах Гарадзенскай вобласці па даручэнні Аляксандра Лукашэнка працавалі супрацоўнікі яго Адміністрацыі.**



Камісія, якую ўзначаліў Кіраўнік Адміністрацыі Лукашэнка Ўладзімір Макей і ў якую ўваходзілі ўсё яго намеснікі, правяла рэйдавую праверку падраздзяленняў і службаў выканаўчых органаў улады па выкананні Дырэктывы Прэзідэнта № 2. Зрэшты, у той дзень адбыліся і планавыя сустрэчы ў працоўных калектывах, дзе службоўцы праводзілі прыём грамадзян па асабістых пытаннях.

У Масты была камандзіраваная першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Лукашэнкі Наталля Пяткевіч.

У Мастах Пяткевіч наведала «Мостоўдрэў», зайшла ў аптэку і краму. Па яе меркаванню, у райцэнтры кошты на прадукты вышэйшыя, чым у Менску. Таксама яе здзівіла наяўнасць чаргі ў краме.

http://masty.belarda.org



## У Мастах няма лекаў ад свінога групу

**Ні ў дзяржаўных ні ў камерцыйных аптэках Мастоў ніводнага з чатырох прэпаратаў ад свінога грыпу няма.**

У Мастоўскай раённай цэнтральнай аптэцы № 10 прэпаратаў «Озелтамівір», «Рыбаверын», «Занамівір» і «Таміфлю» на дадзены момант няма.

Загадчыца адзінай камерцыйнай аптэкі ў Мастах паведаміла, што лекаў ад свінога грыпу ў іх няма і ніколі не было.

Па словах аптэкарак я быў першым хто звярнуўся да іх з пытаннем аб леках ад свінога грыпу.

Ігар АСКІРКА

# Санітарна-эпідэміялагічная сітуацыя ў Беларусі застаецца стабільнай

**У Беларусі захоўваецца стабільная і кантралюемая эпідэмічная сітуацыя па інфекцыйных і паразітарных хваробах сярод насельніцтва. Аб гэтым паведаміла сёння ў час online канферэнцыі на сайце БЕЛТА намеснік міністра аховы здароўя - галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Валянціна Качан.**

Паводле яе слоў, на працягу некалькіх гадоў у рэспубліцы не рэгіструецца паліяміэліт, сібірская язва, халера, бруцэлёз, знізілася захваральнасць на вірусны гепатыт А, коклюш, эпідэмчны паратыт. Назіраецца таксама тэндэнцыя да змяншэння колькасці выпадкаў вострых кішэчных інфекцый, у прыватнасці бактэрыяльнай дызентэрыі. Адзначаюцца перыядычныя ўздымы і спады захваральнасці на сальманелёз і ратавірусную інфекцыю. Фіксуюцца толькі адзінкавыя выпадкі адру, краснухі, паратыфу, шаленства, дыфтэрыі.

Так, за сем месяцаў 2009 года не рэгістраваліся выпадкі па 25 назалагічных формах (тулярэмія, поліяміэліт, адзёр, бруцэлёз, сібірская язва, халера, брушны тыф і інш.), па 43 назалагічных формах адзначалася стабілізацыя або зніжэнне актыўнасці эпідэмічнага працэсу.

Што датычыцца вострых кішэчных інфекцый, то ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года дасягнута зніжэнне паказчыкаў захваральнасці бактэрыяльнай дызентэрыяй на 60 працэнтаў, вірусным гепатытам А - у 2,7 раза. Стабільная эпідэмічная сітуацыя захоўваецца па захваральнасці сальманелёзамі - 25 на 100 тыс. Не было адзначана ўспышак вострых кішэчных інфекцый, паведаміла Валянціна Качан.

У многім дзякуючы шырокаму ахопу насельніцтва прышчэпкамі падтрымліваецца эпідэмічны парадак па вакцынакіруемых хваробах. За студзень-ліпень 2009 года не было выпадкаў захворвання на адзёр і востры поліяміэліт, рэгістраваліся толькі адзінкавыя выпадкі дыфтэрыі (1 выпадак), краснухі (2 выпадкі). На 15 працэнтаў знізілася захваральнасць на коклюш і на 3,6 працэнта - на эпідэмічны паратыт. А ўзровень бактэрыяльных менінгітаў знізіўся на 32 працэнты і склаў 0,47 на 100 тыс. насельніцтва, паведамляе БЕЛТА.

## У Гродна з'явіўся трохзоркавы гатэль

**Гродзенская гасцініца "Турыст" атрымала статус трохзоркавага гатэля. Пра гэта са спасылкай на Цэнтр стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі піша газета "Рэспубліка".**

Для таго каб адпавядаць новаму статусу, у гатэлі адрамантаваны фасад і хол, збудаваныя бізнэс- і канферэнц-залы, а таксама рэстаран і некалькі бараў. Для інвалідаў створаныя пандусы.

У гатэлі "Турыст" — 152 нумары. Там усталяваныя энергазберагальныя шклопакеты, новая мэбля і сантэхніка.

## Суддзя палохала рабочых спецслужбамі

**Спецслужбамі палохала рабочых суддзя ў Мастах. Як ужо паведамляла Еўрарадыё, двое былых рабочых дрэваперапрацоўчага заводу «Мастоўдрэў», аспрэчваючы сваё незаконнае звальненне, падалі ў суд на кіраўніцтва прадпрыемства.**

У Мастоўскім раённым судзе справу рабочыя прайгралі.

Калі яны забіралі рашэнне суду, то суддзя чамусьці забылася прадставіць матывацыйную частку, нягледзячы на тое што рабочыя прасілі падрыхтаваць яе. Калі ж днямі рабочыя прыйшлі ў раённы суд па матывацыйную частку, то былі выкліканыя да суддзі Алы Боцькі.

У кабінеце суддзі яны даведаліся, што імі ўжо цікавяцца спецслужбы, і ўвогуле ім трэба падумаць аб сваёй будучыні і будучыні сваіх дзяцей. Суддзя Боцька настойліва парэкамендавала падумаць некалькі разоў, ці патрэбны ім гэтыя дакументы і ці не баяцца яны праблемаў у будучыні.

Еўрарадыё

АНЕКДОТЫ

Жанчыны часцей звяртаюць увагу не на прыгожых мужчын, а на мужчын з прыгожымі жанчынамі.

***

Магія лічбаў: адыграць вяселле 08.08.08 і развесціся 09.09.09

***

- Чуў? Супраць самалійскіх піратаў паслалі ракетны крэйсер!

- О не! Цяпер у іх яшчэ і крэйсер будзе ...

***

- Падсудны, навошта вы адабралі у пацярпелай гадзіннік?

- Хацеў час даведацца.

- А што, цяжка было спытаць?

- Ой, я такі сціплы з жанчынамі!

***

Калі пражыў палову жыцця, значыць дажыў да паловы смерці.

***

- Дайце, калі ласка, «Віягра».

- «Віягры» няма. Вазьміце «Расцішку". ***

Недахоп інфармацыі нараджае лёгкую эйфарыю, а яе празмернасць - цяжкі дэпрэсіўны стан.

**МАСТОЎСКАЯ ПРАЎДА**

Грамадска-інфармацыйнае выданне Мастоўшчыны

Заснавальнік: Аляксандр ЗАРЭМБЮК.

*Дэпутат Мастоўскага райсавета 24 - га склікання*

Надрукавана на фінасавыя ахвяраванні жыхароў г. Масты ў друкарні ААТ Бліц-Прынт, г. Кіеў вул. Даўжэнка, 9.

Выходзіць 1 раз у месяц.

Распаўсюджваецца бясплатна.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць інфармацыі. Іх меркаванне можа не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі і не накладваюць на яе ніякіх абавязкаў.